**В. Меляшкевіч**

# БЕЗЭКВІВАЛЕНТНЫЯ ФРАЗЕАЛАГІЧНЫЯ АДЗІНКІ З САМАТЫЧНЫМ КАМПАНЕНТАМ *ВОЧЫ/ EYES* У БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ МОВАХ

Даклад прысвечаны праблеме выяўлення тыпалагічных падабенстваў і спецыфікі безэквівалентных фразеалагічных адзінак (далей ФА) з саматычным кампанентам (далей СК) *вочы/eyes* на матэрыяле фразеалагічных слоўнікаў беларускай і англійскай моў. Мы абмежаваліся аналізам безэквівалентных ФА як найбольш цікавых.

Беларускія безэквівалентныя ФА з СК *вока* паводле пакладзеных у іх аснову ўяўленняў аб асаблівасцях жыцця, яго ўмоў, дзеянняў можна падзяліць на наступныя групы:

1) ФА, у аснове якіх адлюстроўваюцца ўяўленні аб асаблівасцях побыту, культуры і паводзін беларусаў (*з п'яных вачэй / воч, заліваць вочы)*;

2) ФА, матываваныя назіраннямі за мімікай, жэстамі, позамі, рухамі чалавека (*лыпаць вачыма*);

3) ФА, якія ўяўляюць сабой праклёны, нядобразычлівыя пажаданні (*соль у вочы*);

4) ФА, якія выражаюць імператыўны характар (*разуй вочы*);

5) ФА, заснаваныя на этыкетных устаноўках з мэтай завуаліраваць негатыўную, неэстэтычную сутнасць з'явы (*выбіраць вочы, выядаць вочы, выкідаць на вока, плюнуць у вочы, замазаць вочы, замыльваць вочы, сляпіць вочы*).

Англійскія безэквівалентныя ФА з СК *eyes* адлюстроўваюць адметнасці культуры англічан, паводле чаго іх можна падзяліць на наступныя групы:

1) ФА, у аснове якіх знаходзяцца ўяленні аб асаблівасцях побыту, культуры і паводзін англічан (*a private eye*);

2) ФА, заснаваныя на этыкетных устаноўках з мэтай завуаліраваць негатыўную, неэстэтычную сутнасць з'явы (*a black eye*);

3) ФА, якія паходзяць з мастацкай літаратуры (*a sight for sore* eyes);

4) ФА, якія грунтуюцца на хрысціянскім веравучэнні і ўвасабляюцца ў форме малітоўнага закліку, абярэгу, пажадання і пад. (*God damn one's eyes!*);

5) ФА, у якіх адлюстраваліся пэўныя важныя моманты спартыўных гульняў (*have / keep one's eye on the ball*).

Такім чынам, семантыка безэквівалентных ФА СК *вычы/eyes* перадае спецыфіку самых розных каштоўнасных арыентацый соцыуму.